## АСАБЛІВАСЦІ ПАДРЫХТОЎКІ КАДРАЎ ДЛЯ СІСТЭМЫ МУЗЫЧНАЙ АДУКАЦЫІ І ВЫХАВАННЯ (НА ПРЫКЛАДЗЕ БЕЛАРУСІ І ЗАМЕЖНЫХ КРАІН)

М.Д.Кузьмініч

Музычна-эстэтычнае выхаванне чалавека з'яўляецца адным з важных напрамкаў у агульным развіцці чалавечай асобы, раскрыцці яго патэнцыяльных творчых магчымасцей. У гэтым сэнсе сістэма музычнага выхавання, якая забяспечвае гарантаваны поспех у фарміраванні музычнай культуры грамадства, уяўляе сабой пэўную агульначалавечую каштоўнасць. Тут можна прыгадаць сістэмы музычна-эстэтычнага выхавання дзяцей З.Кодаі, К.Орфа, Д.Кабалеўскага і інш. Можна таксама весці гаворку аб вопыце і масштабах укаранення гэтых ці падобных да іх сістэм у агульнаадукацыйных і музычных школах у розных краінах свету. Але нас цікавяць нейкія агульныя для усіх высокаразвітых краін падыходы у падрыхтоўке кадраў для сістэмы музычнага выхавання і адукацыі, бо ад узроўня падрыхтоўкі кадраў ва многім залежыць канчатковы вынік. Актуальнасць гэтай праблемы вызначаецца і тым, што на факультэце Мастацкай творчасці Інстытута культуры ідзе актыўны пошук шляхоў удасканалення падрыхтоўкі кадраў спецыялістаў, удакладняецца пералік спецыяльнасцей і спецыялізацый, мяняецца вучэбны план.

Як жа арганізаваны працэс падрыхтоўкі кадраў у галіне музычнага мастацтва ў замежных краінах?

Першае, што хочацца адзначыць, гэта тая ўвага, якая надаецца музычнаму выхаванню дзяцей у агульнаадукацыйных школах. Адпаведна, усе сярэднія і вышэйшыя навучальныя установы ў большай ці меншай ступені рыхтуюць кадры менавіта для агульнаадукацыйных школ.

Так, у Нямеччыне настаўнікаў музыкі для агульнаадукацыйных школ (пачатковыя класы) рыхтуюць педагагічныя, выхаваўча-навуковыя і агульныя вышэйшыя школы. Вышэйшыя музычныя школы, кансерваторыі, акадэміі выпускаюць выканаўцаў, прыватных настаўнікаў музыкі, педагогаў музычных і агульнаадукацыйных (сярэднія і старэйшыя класы) школ. Вельмі часта адны і тыя ж выкладчыкі



РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

працуюць у музычных і агульнаадукацыйных школах. Таму ў ВНУ назіраецца імкненне да уніфікацыі вучэбных праграм і экзаменацыйных патрабаванняў пры падрыхтоўцы спецыялістаў. У апошні час у Вышэйшых музычных школах з'явіліся новыя спецыялізацыі для падрыхтоўкі музычных бібліятэкараў, інструментальных майстраў, ваенных музыкантаў, гукааператараў і гукаінжынераў, педагогаў-выканаўцаў для агульнаадукацыйных школ і дзіцячых тэатраў, педагогаў для цэнтраў свабоднага часу.

У Фінляндыі выкладчыкі музыкі I–VI класаў агульнаадукацыйных школ скончылі, як правіла, школьныя аддзяленні універсітэтаў (2 або 4 гады навучання). У старэйшых класах выкладаюць выпускнікі Музычнай Акадэміі імя Сібеліуса і Музычных Універсітэтаў (5–6 год навучання), якія размяркоўваюцца таксама ў прафесійныя калектывы, музычныя школы, каледжы, кансерваторыі.

У Англіі для пачатковых класаў агульнаадукацыйных школ настаўнікаў рыхтуюць музычныя каледжы, а для сярэдніх і старэйшых класаў – музычна-педагагічныя факультэты універсітэтаў (4 гады навучання). Пры гэтым студэнты на працягу 3 год атрымліваюць музычную падрыхтоўку, а чацверты – педагагічную. Выпускнікі павінны умець: іграць на богаслужэннях, кіраваць хорам, ансамблем, аркестрам; вучыць ігры на інструменце; ставіць голас; засвоіць вакальную педагогіку і хоразнаўства; валодаць 3 музычнымі інструментамі (фартэпіяна, скрыпка, народны (духавы) інструмент). Выпускнікі Музычнай Акадэміі працуюць у прафесійных калектывах, альбо запісваюцца на дадатковыя педагагічныя курсы дзеля атрымання педагагічнай кваліфікацыі.

У ЗША музычную адукацыю можна набыць у каледжах з атрыманнем звання бакалаўра (4 гады навучання), магістра-майстра (5 год навучання), доктара музыкі (7 год навучання). Каледжы дзеляцца на выканаўчыя, музыказнаўчыя, педагагічныя. Вышэйшую музычную адукацыю даюць таксама музычныя факультэты Універсітэтаў па наступных спецыяльнасцях: музычная адукацыя, музычная гісторыя і крытыка, музыка (выканаўства, кампазіцыя, тэорыя), музыка (зводныя мастацкія праграмы).

Такім чынам, можна зазначыць, што музычныя навучальныя установы на Захадзе спецыяльна не рыхтуюць кадры для кіраўніцтва аматарскімі калектывамі. Выпускнікі Вышэйшых музычных школ пра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цуюць не толькі ў прафесійным мастацтве, але (як і выпускнікі музычных факультэтаў Універсітэтаў) і ў агульнаадукацыйных школах. Хаця адзіныя планы падрыхтоўкі кадраў адсутнічаюць, тым не менш назіраецца тэндэнцыя да уніфікацыі вышэйшай музычна-педагагічнай адукацыі. Пасля поўнай музычна-тэарэтычнай і выканальніцкай падрыхтоўкі студэнты Вышэйшых музычных школ слухаюць курс музычнай педагогікі. У адпаведнасці з праслуханым курсам студэнт атрымоўвае званне бакалаўра, магістра (майстра), або доктара музыкі і займае адпаведную пасаду ў грамадстве.

У святле сказанага вышэй, дзейнасць Беларускай акадэміі музыкі і музычнага факультэта Педагагічнага інстытута адпавядае напрамкам работы музычных ВНУ на Захадзе. Што тычыцца Інстытута культуры, то яму, відаць, трэба адмовіцца ад падрыхтоўкі кіраўнікоў аматарскіх калектываў для устаноў культуры як адзінага і пры тым галоўнага накірунка дзейнасці. Найбольш перспектыўнай і мэтазгоднай, на наш погляд, будзе выглядаць педагагізацыя зместу вучэбнага працэсу - арыентацыя яго выпускнікоў на работу ў агульнаадукацыйных школах (сярэднія і старэйшыя класы, школьныя аркестры, ансамблі, хоры, тэатры, танцавальныя калектывы), у школах з музычна-харавым, тэатральным альбо харэаграфічным ухілам), у Школах мастацтваў і дасугавых цэнтрах. У адрозненне ад музычнага факультэта Педагагічнага інстытута падрыхтоўка спецыялістаў у Інстытуце культуры павінна быць больш шырока скіравана на па-зашкольную работу, мець глыбейшую музычную (тэарэтычную і практычную) падрыхтоўку і нацыянальную (фальклорную) афарбоўку. На нашу думку, выпускнікі мастацкіх спецыялізацый Інстытута культуры змаглі б весці на высокім прафесійным узроўні не толькі урокі музыкі, але і забяспечыць выкладанне прадмета "Гісторыя сусветнай мастацкай культуры", вучыць ігры на музычных інструментах, кіраваць хорам, аркестрам, ансамблем, праводзіць школьныя культурна-масавыя мерапрыемствы.

Такім чынам, аналіз падрыхтоўкі кадраў арганізатараў музычнага выхавання і адукацыі ў развітых замежных краінах дае падставы гаварыць аб існаванні там агульных падыходаў у вырашэнні гэтай праблемы. Арганізацыя музычнага выхавання ў Беларусі на сённяшні дзень не дазваляе дабіцца значных поспехаў у фарміраванні высокай музычнай культуры грамадства. Вырашэнне праблемы



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мы бачым у актывізацыі музычна-выхаваўчай (і ўвогуле – мастацкай) дзейнасці ў агульнаадукацыйных школах і ў падрыхтоўцы адпаведных кадраў арганізатараў музычна-эстэтычнага выхавання, у прыватнасці, на факультэце Мастацкай творчасці Інстытута культуры.

## ДАМРОВАЕ ВЫКАНАЛЬНІЦТВА Ў БЕЛАРУСІ І ПЕРСПЕКТЫВЫ ЯГО РАЗВІЦЦЯ

Л.С.Таірава

Развіцце дамровага выканальніцтва ў Беларусі – гэта даволі складаны і супярэчлівы працэс, звязаны са шматлікімі фактарамі (эканамічнымі, палітычнымі, культурнымі), залежны ад аб'ектыўных і суб'ектыўных абставін. Так, забарона домры як інструмента замежнага (рускага) паходжання – характэрна не толькі для Беларусі. Аналагічная сітуацыя склалася таксама на Украіне, дзе змагаюцца за развіцце і распаўсюджванне нацыянальнай бандуры, супраць домры. Трэба таксама ўлічваць і тое, што домра ў нашай рэспубліцы знаходзіцца ў пастаяннай конкурснай барацьбе з такім эфектным і гучным інструментам як цымбалы.

Быў час, калі домру лічылі чыста аркестравым ці ансамблевым інструментам абмежаваных магчымасцей. І толькі зусім нядаўна пачалося паспяховае ўзыходжанне домры на канцэртнай эстрадзе ў якасці саліруючага інструмента. У домры з'явілася нямала прыхільнікаў і аматараў, захопленых яе непаўторным, пявучым гукам, багаццем тэхнічных і выяўленчых магчымасцей. Сёння бурны рост дамровага выканальніцтва на Беларусі абумоўлены шэрагам абставін:

– добрым станам беларускай айчыннай дамровай педагогікі, прычым на ўсіх узроўнях. Пачынаючы з ДМШ, педагогі-дамрысты ў большасці сваім працуюць добрасумленна на станоўчым прафесійным узроўні, шукаючы новыя, выразныя выяўленчыя магчымасці інструмента. Пры гэтым, прыток дзяцей на домру далёка не самы лепшы. Часцей за ўсё сюды прыходзяць тыя, хто не паступіў на фартэпіяна ці гітару;

– жыватворны ўплыў на ўсе народна-інструментальныя жанры, у тым ліку і на домру, аказваюць рэспубліканскія конкурсы імя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ